американских исследований Российского университета дружбы народов (директор Ю. Н. Мосейкин), Иберо-американский центр Московского государственного института международных отношений, руководимый А. В. Шестопалом, и др.

Таким образом, в Советском Союзе была создана своя школа латиноамериканских исследований, ставшая одним из крупнейших мировых центров по изучению Латинской Америки. Окончательная институционализация советской школы латиноамериканистики произошла в 1961 г. с созданием ИЛА АН СССР. Заслугой советских ученых является то, что они впервые стали изучать историю Латинской Америки с позиций, базировавшихся на формационном подходе и марксистской методологии.

Современная российская латиноамериканистика – динамично развивающаяся отрасль исторической науки. Она представляет собой сложившуюся школу исследований по латиноамериканской проблематике и во многом является наследницей советской школы, получившей, благодаря исследованиям Ю. В. Кнорозова, широкое международное признание. И хотя в истории древнейших цивилизаций Центральной и Южной Америки, колониального периода, современного развития Латинской Америки остается еще немало белых пятен, требующих изучения, успехи ее в советские годы очевидны. Дешифровка письма майя Ю. В. Кнорозовым комплексное изучение древнейших народов континента, доколумбовых цивилизаций майя, ацтеков, инков, которые заняли достойное место в ряду цивилизаций Древнего мира, в том числе благодаря советским исследованиям национально-освободительного движения и других тем открыли путь советской латиноамериканистике на мировую арену. Дальнейшее изучение доколумбовых культур, роли религиозного, а также индейского, европейского и африканского этнокультурных факторов в формировании латиноамериканской цивилизации, современной этнокультурной ситуации позволит глубже понять суть синкретических процессов в регионе.

Латиноамериканистика на современном этапе, как и вся историческая наука, постепенно избавляется от идеологической закостенелости. Освободившись от заидеологизированности, российские ученые стараются по-новому и беспристрастно взглянуть на многие аспекты латиноамериканской истории, в том числе на колониальную эпоху. На страницах журнала «Латинская Америка», по сей день являющегося ведущим научным периодическим изданием в России и в странах СНГ, публикуются материалы не только по истории Латинской Америки, но и различным аспектам экономической, политической, культурной жизни региона. Ведущим научным центром, координирующим работу российских латиноамериканистов, остается ИЛА РАН.

**Список использованных источников**

1. *Энгельс, Ф.* Происхождение семьи, частной собственности и государства / Ф. Энгельс / Институт Маркса – Энгельса – Ленина при ЦК ВКП(б). – 2-е изд. – М.: Партиздат, 1932. – 186 с.



2. *Кнорозов, Ю. В.* «Сообщение о делах в Юкатане» Диэго де Ланда как историко-этнографический источник: автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.07 / Ю. В. Кнорозов; АН СССР, Ин-т этнографии им. Н. Н. Миклухо-Маклая. – Л., 1955. – 14 с.

3. *Кнорозов, Ю. В.* Краткие итоги изучения древней письменности майя в Советском Союзе / Ю. В. Кнорозов // Доклады советской делегации на X Международном конгрессе историков в Риме. – М.: Изд-во Акад. наук СССР, 1955. – 53 с.

4. Латинская Америка. Энциклопедический справочник: в 2 т. / гл. ред. В. В. Вольский. – М.: Сов. энцикл., 1982.

5. *Шемякин, Я. Г.* Европа и Латинская Америка: взаимодействие цивилизаций в контексте всемирной истории / Я. Г. Шемякин. – М.: Наука, 2001. − 392 с.

6. *Шемякин, Я. Г.* Латинская Америка: традиции и современность / Я. Г. Шемякин. – М.: Наука, 1987. − 190 с.

7. Культура Латинской Америки. Энциклопедия / РАН, Ин-т Латин. Америки; редкол.: П. А. Пичугин (отв. ред.) [и др.]. − М.: Рос. полит. энцикл. (РОССПЭН), 2000. − 744 с.

8. Энциклопедия. Латинская Америка / РАН, Ин-т Латин. Америки; глав. ред. В. М. Давыдов. – М.: Экономика, 2013. – 950 с.

**(Дата подачи: 04.02.2015 г.)**

*Ю. М. Кежа*
Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, Мінск
*J. N. Kezha*
National Institute of Higher Edukation, Minsk

**УДК 94(4)**

## МЕСЦА І РОЛЯ ПОЛАЦКІХ КНЯЗЁЎ У СІСТЭМЕ ЎЛАДЫ СТАРАЖЫТНАЙ РУСІ XI СТАГОДДЗЯ

## THE PLACE AND ROLE OF POLOTSK PRINCES IN THE POWER SYSTEM OF ANCIENT RUS IN XI CENTRY

*У артыкуле аналізуюцца міжкняжацкія адносіны паміж прадстаўнікамі полацкай дынастыі: Брачыславам Ізяславічам (1003–1044), Усяславам Брачыславічам (1044–1101) і паўднёварускімі князямі Рурыкавічамі. У адпаведнасці з разглядам старажытнарускіх летапісных крыніц робіцца выснова аб фарміраванні адмоўнага вобраза полацкага князя Усяслава галоўным чынам з-за парушэння агульных родавых нормаў княжацкага права.*

*Ключавыя словы: полацкая зямля; княжацкая ўлада; Рагвалодавічы; Яраславічы; кіеўская спадчына.*

*The article analyzes the relationship between the meknyazheskie Polotsk Dynasty: Brjachislav Izyaslavich (1003–1044), Vseslav (1044–1101) and the southern Russian princes Ryurikavichami. In accordance with the consideration of ancient chronicles, the conclusion about the formation of a negative image of the Prince of Polotsk Vseslav mainly due to violations of the rules of common generic princely rights.*

*Key worlds: principality of polotsk; princely power; rogvolodovichi; yaroslavichy; kyiv inheritance.*

Пачатак XI ст. для беларускіх зямель адзначаецца часам афармлення і паступовага развіцця дзяржаўнасці на тэрыторыі Сярэдняга Падзвіння з цэнтрам у Полацку. Пасля смерці ў 1001 г. сына Уладзіміра і Рагнеды Ізяслава

Полацкая зямля выходзіць з-пад уплыву Кіева. На Полаччыне канчаткова афармляецца ўласная дынастыя Рагвалодавічаў, якая вылучаецца з агульнай лініі Рурыкавічаў і замацоўвае за сабой права на ўладу ў Полацкай зямлі [1, с. 93–99].

Смерць полацкага князя ў пачатку XI ст., раней за Уладзіміра (памёр у 1015 г.) абумовіла адасобленасць нашчадкаў Ізяслава і пэўную замкнёнасць Рагвалодавічаў, улада якіх абмяжоўвалася выключна Полацкай зямлёй [2; 3, с. 5; 4, с. 33].

Можна меркаваць, што полацкая дынастыя Рагвалодавічаў згодна з агульнымі родавымі ўяўленнямі княжацкага дому Рурыкавічаў не мела права на ўладу ў Кіеве. Аналагічныя паралелі падобнай сістэме міжкняжацкіх адносін, калі ўладныя правы роду старэйшага сына ўладара пры яго ранняй смерці абмяжоўваюцца пэўнай зямлёй, назіраюцца ў гісторыі Франкскай дзяржавы IX ст. [5, с. 106; 2].

Такім чынам, у пачатку – першай палове XI ст. на тэрыторыі Усходняй Еўропы былі сфарміраваны дзве вотчыны са сваімі ўласнымі дынастычнымі лініямі: уладанні полацкіх князёў – нашчадкаў Рагвалода, улада якіх распаўсюджвалася выключна на Полацкую зямлю, і вотчына Яраслава і яго нашчадкаў Яраславічаў – астатняя тэрыторыя Старажытнай Русі.

Ранняе замацаванне за дынастыяй Рагвалодавічаў правоў на Полацкую зямлю, пачынаючы са смерці Ізяслава, аўтаматычна пазбаўляла наступных Рагвалодавічаў палітычных правоў на Кіеў. Дадзеная акалічнасць прадвызначыла месца Полацкай зямлі ў палітычнай сістэме Старажытнай Русі: нашчадкі Яраслава Уладзіміравіча, маркіруючы адасобленасць полацкай дынастыі, у летапісах будуць падкрэсліваць іх «іншароднасць» [6, с. 31].

Аналізуючы старажытнарускія летапісныя матэрыялы, варта адзначыць, што, пачынаючы ад Усяслава Брачыславіча, спыняюцца ўсе спробы звязаць полацкіх князёў з князямі кіеўскімі [7, с. 30]. Паводле высноў украінскай даследчыцы М. А. Філіповіч, «полацкія звесткі», прадстаўленыя ў старажытнарускіх крыніцах, можна падзяліць на «кіеўскія» і «наўгародскія». Наўгародскі летапісец пазіцыянуе Полацк як адзін з варожых і небяспечных гарадоў. Гэта даволі яскрава бачна ў некаторых эсхаталагічных апісаннях, якія суправаджаліся напярэдадні паходаў Усяслава Брачыславіча на Пскоў і Ноўгарад [8, с. 183–184].

Разглядаючы «кіеўскія звесткі» пра Полацк, М. А. Філіповіч прыйшла да высновы, што дадзеныя паведамленні можна падзяліць на аўтарства Кіева – Пячэрскага летапісца, лаяльнага Святаполку Ізяславічу, дзе вобраз полацкага князя асвятляецца як «князя-пакутніка». З другога боку, даследчыца вылучае паведамленні летапісца, лаяльнага да Уладзіміра Манамаха, дзе ў кантэксце «чужой», «незнаёмай» і «варожай» разглядаецца старажытнарускімі летапісцамі Полацкая зямля [7, с. 37].

Паказальна, што старажытнарускія летапісцы пры апісанні падзей, звязаных з полацкай гісторыяй, разглядаюць Полацкую зямлі як «варожую»,



пачынаючы з перыяду праўлення Усяслава Брачыславіча. Што датычыцца звестак пра Брачыслава, то ён не пазіцыянуецца як князь абсалютна адасоблены ад радавога кола Рурыкавічаў.

Яраслаў у 1021 г. заключае з Брачыславам пагадненне, паводле якога да ўладанняў полацкага князя адыходзяць стратэгічныя пункты на гандлёвым шляху – Віцебск і Усвяты. Пра характар гэтага пагаднення паведамляе Сафійскі I летапіс: «И рече (Яраслаў. – *Ю. К.*) ему "буде же со мною за один" и воеваша Брячиславъ с великимъ Ярославомъ вся дни живота своего» [9, с. 99].

Такім чынам, згодна з паведамленнем летапісу, паміж Брачыславам і Яраславам быў утвораны ваенна-палітычны саюз. Дадаючы да гэтых фрагментарных звестак сведчанні скандынаўскай «Пасмы аб Эймундзе», некаторыя даследчыкі прыйшлі да высновы аб супольным кіраванні Брачыслава і Яраслава ў Кіеве, што можа сведчыць аб пэўных прэтэнзіях полацкага князя на кіеўскую спадчыну [10, с. 18–21; 11].

Нягледзячы на тое, што звесткі старажытнарускіх крыніц часткова пераклікаюцца са звесткамі «Пасмы аб Эймундзе», усходнеславянскія крыніцы дакладна паведамляюць толькі аб мірнай дамове паміж Брачыславам і Яраславам. У сваю чаргу скандынаўскія звесткі пра падзеі пачатку XI ст., зафіксаваныя ў XIII ст., маюць пэўную тэндэнцыйнасць і непаслядоўнасць.

Апісваючы вынікі міру паміж Яраславам (Ярыслейфам) і Брачыславам (Вартылавам), аўтар «Пасмы» паведамляе пра атрыманне Яраславам Ноўгарада (Хольмгарда), які аўтар называе «лепшай часткай Гардарыкі», тады як Кіеў (Кэнунгард), які дастаўся Брачыславу, – «другой лепшай часткай з данінай і паборамі» [12]. А. І. Ляшчанка звярнуў увагу на тое, што аўтар «Пасмы» супярэчыць сам сябе, калі ў пачатку твора называе Кэнунгард (Кіеў) самай важнай часткай Гардарыкі; напрыканцы паведамлення гэты эпітэт ён выкарыстоўвае да Ноўгарада [13, с. 1083]. У сваю чаргу большасць даследчыкаў лічаць неверагодным княжэнне ў Полацку варага Эймунда, які яму дастаўся пасля дамовы, тым больш што ў летапісах узгадваецца пра княжэнне ў Полацку менавіта Брачыслава, які панаваў у горадзе да сваёй смерці, а пасля яго ў 1044 г. полацкі стол заняў яго сын Усяслаў [12; 14, с. 52].

Калі пагаджацца з паведамленнем «Пасмы» аб «кіеўскім княжэнні» Брачыслава, то найбольш пераканаўчым варта прызнаць гіпотэзу В. І. Сянькоўскага. Кіеў быў аддадзены Брачыславу не ў поўнае і безумоўнае яго валоданне, а толькі ў кіраванне ад імя Яраслава з правам збору даніны, аб чым узгадвае ўласна «Пасма». У гэтым сэнсе Яраслаў Уладзіміравіч пасля дамовы застаецца кіеўскім князем. Брачыслаў, у сваю чаргу, атрымоўвае частку Кіеўскага княства з правам збору падаткаў, не прэтэндуючы пры гэтым на палітычнае панаванне [15, с. 71]. Такім чынам, стаўленне летапісцаў да Брачыслава як да асобы, звязанай нароўні з Ізяславам роднаснымі сувязямі

з Рурыкавічамі, было абумоўлена яго ваенна-палітычным саюзам з Яраславам 1021 г. Кіеўскі князь не мог не ўлічваць эканамічныя мэты і інтарэсы Полацка, які ў перыяд княжання Брачыслава пераходзіць да актыўнай ваеннай палітыкі. Але пры гэтым, на нашу думку, нельга пагадзіцца з тэзай аб імкненні Брачыслава авалодаць Кіевам і тым самым вярнуць Рагвалодавічам права на вялікакняжацкую спадчыну, фактычна страчаную ў 1001 г.

Пасля смерці Брачыслава Ізяславіча Полацкі пасад заняў яго сын Усяслаў Брачыславіч (1044–1101). У параўнанні з Ізяславам Уладзіміравічам і Брачыславам Ізяславічам, асоба Усяслава ў старажытнарускіх летапісцаў пачынае набываць яскрава вылучаныя «адмоўныя» рысы.

Упершыню ўзгадка пра Усяслава змешчана ў летапісным артыкуле АМЧ 6522 (1044 г.): «В се же лето оумре Брячиславъ, сынъ Изяславль, внукъ Володимерь, отец Всеславль и Всеславъ сынъ его седе на столе его. Егоже роди мати от вълхвования, матери бо родивши его бысть ему язвено на главе его. Рекоша бо волсви матери его: "се язвено навяжи на нь да носит его до живота своего". Еже носить Всеславъ и до сего дне на собе. Сего ради и немилостивъ есть на кровьпролитье» [16, с. 109]. Варта адзначыць, што, акрамя Усяслава Полацкага, падобныя паведамленні і эпітэты ў адносінах да старажытнарускіх князёў хрысціянскага часу больш не ўжываліся. Усяслаў Брачыславіч пазіцыянуецца як уладар, які з моманту нараджэння мае некаторыя дачыненні да язычніцкіх дзеянняў пры пэўным удзеле паганскіх святароў.

Выразныя эсхталагічныя вобразы ўтрымоўваюць звесткі пра падзеі 1065 г., якія папярэднічалі нападам Усяслава на Пскоў і Ноўгарад [8, с. 184]. У Сінадальным спісе Наўгародскага летапісу пад тым жа 6573 (1065 г.) паведамляецца: «Почя Всеславъ рать дрьжяти; и на западе явися звезда велика» [8, с. 17]. Далей наўгародскі летапісец падрабязна распавядае пра захоп і рабаванне Усяславам Ноўгарада ў 1066 г.: «Приде Всеславъ и възя Новъгородъ, съ женами и съ детьми; и колоколы съима у Святыя Софие. О, велика бяше беда въ час тыи; и понекадила съима» [8, с.17].

Полацк на працягу доўгіх гадоў быў адным з галоўных ворагаў Ноўгарада. Стаўленне наўгародскага летапісца да асобы Усяслава Брачыславіча цалкам у адмоўным, негатыўным ключы зразумела: Усяслаў напаў на Ноўгарад, разрабаваў горад і, што самае галоўнае, разрабаваў галоўную наўгародскую святыню – Сабор Святой Сафіі. У гэтым сэнсе ўсе паведамленні пра Усяслава, якія даследчыкі суадносяць з аўтарствам наўгародскага летапісца, пазіцыянуюць полацкага князя як бязлітаснага, жорсткага ваяра, які не шкадуе ні насельніцтва, ні святыні Ноўгарада.

Асобныя паведамленні кіеўскіх летапісцаў пра дзейнасць Усяслава Брачыславіча значна адрозніваюцца паміж сабой. Пад 6568 (1060 г.) АМЧ паведамляе аб Усяславе як аб удзельніку сумеснага паходу з паўднёварускімі князямі на торкаў [16, с. 115].

1065 г. стаў паваротным для палітычнай гісторыі Полацкай зямлі і азначаў пераход ад мірнага суіснавання Усяслава з суседнімі князямі да ваенных



канфліктаў. Пасля рабавання ў 1066 г. Ноўгарада пачынаюцца ваенныя канфлікты Усяслава з паўднёварускім трыумфіратам – братамі Ізяславам, Святаславам і Усеваладам. Пад 6575 (1067 г.) «Аповесць аб мінулых часах» паведамляе пра Усяслава, пераможанага ў бітве з Яраславічамі на р. Нямізе, затым праз некалькі месяцаў захопленага ў палон разам з двумя сынамі [16, с. 117].

Пад 1068 г. летапісец, распавядаючы пра кіеўскае паўстанне, гаворыць аб «цудоўным» вызваленні Усяслава Брачыславіча з поруба [16, с. 120–121]. На думку летапісца, вызваленне Усяслава адбылося з-за ранейшага парушэння крыжацалавання Яраславічаў. У выніку было здзейснена пакаранне старэйшага Ізяслава і пазбаўленне яго ўлады. Як адзначаў Л. В. Аляксееў, постаць Усяслава Брачыславіча набывае арэол «князя-пакутніка», які стаў ахвярай змовы і падману Яраславічаў [17, с. 243].

Нельга казаць аб тым, што дзякуючы гэтай падзеі асоба Усяслава набывае пазітыўныя рысы. Гісторыя з Усяславам разглядаецца летапісцам як «Божая кара», накіраваная ў першую чаргу на Ізяслава за парушаную клятву. Усяслаў у вачах летапісца з'яўляўся «ахвярай абставін». У гэтым сэнсе ў паведамленні АМЧ 6576 (1068 г.) няма прамога абгрунтавання ўкняжэння Усяслава ў Кіеве. Летапісец нічога не гаворыць пра законнае права полацкага князя на кіеўскі стол.

Калі першы блок «кіеўскіх звестак» пра Усяслава можна характарызаваць як спачувальны і ў цэлым нейтральны, то паведамленне пра паморак, які адбыўся ў Полацкай зямлі 1092 г., вызначае іншыя адносіны да Полаччыны з боку кіеўскага летапісца. Паводле паведамлення, Полацкую зямлю ў гэтым годзе напаткала нашэсце нябачных бесаў на канях, якія забівалі палачан [16, с. 150–151].

Дадзенае паведамленне, на думку М. А. Філіповіч, адносіцца да твора манаха Выдубіцкага манастыра Сільвестра (1116 г.) і адлюстроўвае ў першую чаргу праманамахаўскія палітычныя тэндэнцыі. Вобраз Полацкай зямлі ў час княжэння Усяслава Брачыславіча асвячаўся праманамахаўскім летапісцам з увасабленнем «варожых» і «небяспечных» якасцяў [7, с. 34–35]. У сваю чаргу паведамленні 6575 (1067 г.), 6576 (1068 г.) адлюстроўваюць Кіева – Пячэрскае летапісанне, якое складалася пры кіраванні Святаполка Ізяславіча (1092–1113 гг.). Паведамленні кіеўскіх летапісцаў гэтага перыяду характарызуюць асобу полацкага князя Усяслава ў цэлым нейтральна. Паказальна, што Усяслаў у падзеях 1067–1068 гг. паўстае як «князь-пакутнік», ахвяра парушанай клятвы.

Адносіны старажытнарускіх летапісцаў да Усяслава Брачыславіча і ўспрыняцце Полацкай зямлі як «варожай» і «невядомай» абумоўлены не толькі актыўнай ваяўнічай дзейнасцю полацкага князя. Безумоўна, напад на Ноўгарад, пагром горада і рабаванне галоўнай яго святыні адмоўна адлюстраваліся на вобразе Усяслава і абумовілі негатыўнае стаўленне да яго і яго ўладанняў (Полацкага княства) з боку летапісцаў. Акрамя гэта-

га, Усяслаў Брачыславіч праявіў сябе як парушыцель усталяваных норм агульнага права і ўспрымаўся як князь, пазбаўлены агульнахрысціянскіх каштоўнасцей.

Пэўныя акалічнасці – валхаванне пры нараджэнні князя; прысутнасць пры нараджэнні будучага князя валхвоў; нашэнне князем у якасці амулета «язвена» – абсалютна нетыпічныя для іншых князёў Рурыкавічаў. Апісваючы ваяўнічыя паходы полацкага князя, летапісец характарызуе яго дзейнасць як абсалютна непрымальную і выходзячую за нормы хрысціянскага ўладара: бязлітаснасць князя – «немилостивъ есть на кровыпролитье», разрабаванне галоўнай святыні – Наўгародскай Сафіі. Да таго ж у Наўгародскім першым летапісе і ў «Аповесці мінулых часоў» змешчаны паведамленні эсхаталагічнага характару, напрамую звязаныя з ваяўнічай дзейнасцю Усяслава Брачыславіча ў 1065–1066 гг. Таксама Полацкае княства ў старажытнарускіх летапісах успрымаецца як зямля «невядомая» і «чужая». Эсхаталагічныя матывы, звязаныя з Полацкай зямлёй, прадстаўлены ў паведамленні 6600 (1092 г.).

На нашу думку, адмоўнае стаўленнне да Усяслава Брачыславіча ў параўнанні з яго папярэднікамі Ізяслам Уладзіміравічам і Брачыславам Ізяславічам абумоўлена яго непрацяглым кіеўскім княжэннем (1068–1069 гг.). Кіеў з 1001 г. перастаў разглядацца як верагодная вотчына нашчадкаў Рагвалода. У адпаведнасці з нормамі «родавага сюзерэнітэту» полацкая дынастыя была вылучана з агульнага кола Рурыкавічаў і не мела правоў на Кіеў.

Нягледзячы на гэта ў міжкняжацкіх адносінах з 20-х гг. XI ст. назіраецца стаўленне да Брачыслава Ізяславіча з боку яго дзядзькі Яраслава як да раўнага па статусу саюзніка. Брачыслаў у летапісных крыніцах кардынальна не супрацьпастаўляецца Яраславічам, бо полацкі князь відавочных прэтэнзій на кіеўскі пасад не ажыццяўляе.

У сваю чаргу негатыўнае стаўленне да Полацкай зямлі, у прыватнасці да князя Усяслава Брачыславіча, было абумоўлена як яго ваяўнічай дзейнасцю, так і кіеўскім княжэннем. Усяслаў наперакор усталяваным нормам родавага права, паводле якіх ён павінен быў абмяжоўвацца ўладай над Полаччынай, набывае кіеўскі пасад. Сам факт яго сямімесячнага знаходжання ў Кіеве ў якасці князя абсалютна не ўпісваецца ў родавыя нормы княжацкай дынастыі Рурыкавічаў. Адмоўнае і варожае стаўленне да Усяслава з боку кіеўскіх летапісцаў абумоўлена гэтым парушэннем агульнадынастычных норм княжацкага сямейнага права. Асоба Усяслава Брачыславіча, яго паводзіны і дзейнасць у палітычнай гісторыі Старажытнай Русі другой паловы XI ст. нароўні з забойствам Барыса і Глеба атрымалі характар адхілення ад прынятых у палітыцы нормаў [18, с. 5].

У гэтай сувязі спробу ўкняжэння ў Полацку сыноў Ізяслава (1069–1071 гг.) можна трактаваць як пазбаўленне Усяслава яго ўладанняў з-за кіеўскага княжэння 1068–1069 гг. Парушыўшы нормы княжацкага права, Усяслаў Брачыславіч пазбаўляўся свайго законнага ўладання – Полацкай зямлі.



Такім чынам міжкняжацкія ўзаемаадносіны паміж паўднёварускімі князямі Яраславічамі і полацкімі Рагвалодавічамі – Брачыславам Ізяславічам і Усяславам Брачыславічам – былі абумоўлены вылучанасцю полацкай княжацкай дынастыі з агульнага роду Рурыкавічаў. Пасля смерці Ізяслава Уладзіміравіча (1001 г.) за яго нашчадкамі замацоўвалася манапольнае права на Полацкую зямлю, пры гэтым Рагвалодавічы былі назаўсёды пазбаўлены кіеўскага княжэння.

Перыяд праўлення Брачыслава характарызуецца ваенна-палітычным саюзам з Яраславам. Стаўленне да Брачыслава з боку старажытнарускіх летапісцаў (якія пісалі свае творы па заказу князёў) у агульным кантэксце нейтральнае. Брачыслаў не разглядаецца як князь, абсалютна адасоблены ад дынастыі Рурыкавічаў. У сваю чаргу іншае пазіцыянаванне полацкага князя Усяслава і ўсёй Полацкай зямлі кіеўскімі і наўгародскімі летапісцамі абумоўлена яго непрацяглым кіеўскім княжэннем (1068–1069 гг.), калі Усяслаў наперакор агульнародавым нормам княжацкага права займаў кіеўскі пасад. Гэтым абумоўлена часовае пазбаўленне ўлады Усяслава ў Полацку (1069–1071 гг.) і далейшае дыстанцыянаванне нашчадкаў Усяслава ад Яраславічаў.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. *Кежа, Ю. М.* Да пытання аб станаўленні ўлады Рагвалодавічаў у Полацку / Ю. М. Кежа // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў: зб. навук. арт. II міжнар. навук. канф., Полацк, 17–18 крас. 2014 г.: у 2 ч. – Наваполацк: ПДУ. – Ч. 2. – С. 92–100.

2. *Плотникова, О. А.* Кристаллизация института княжеской власти как социально-политического компонента древнерусской цивилизации [Электронный ресурс] / О. А. Плотникова. – Режим доступа: http://www.zpu-journal.ru/e-zpu/2008/6/Plotnikova_crystallization/. – Дата доступа: 02.02.2013.

3. *Насевіч, В. Л.* Генеалагічныя табліцы старадаўніх княжацкіх і магнацкіх беларускіх родаў XII–XVIII стагоддзяў / В. Л. Насевіч. – Мінск: БелЭн, 1993.

4. *Пресняков, А. Е.* Княжое право в Древней Руси / А. Е. Пресняков – М.: Наука, 1993. – 634 с.

5. История средних веков: учеб. пособие: в 3 ч. / В. А. Федосик [и др.]; под ред. В. А. Федосика, И. О. Евтухова. – Минск: Изд. Центр БГУ, 2008. – Ч. 1. – 255 с.

6. *Толочко, А. П.* Князь в Древней Руси: власть, собственность, идеология / А. П. Толочко. – Киев: Наук. думка, 1992. – 224 с.

7. *Філіпович, М. А.* Полоцька земля в літописних та актових джерелах XI–XVI століть / М. А. Філіпович. – К., 2014. – 204 с.

8. Новгородская первая летопись старшего и младшего изводов. – М.: Изд-во Акад. наук СССР, 1950. – 576 с., ил.

9. ПСРЛ. – Т. 6. VI: Софийские летописи. – СПб., 1853. – 360 с.

10. *Заяц, Ю. А.* Полоцкий княжеский дом: правовой аспект взаимоотношений князей Полоцкого и Киевского домов (985–1129 гг.) / Ю. А. Заяц // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск: Беларус. навука, 2013. – Вып. 24. – С. 18–22.

11. *Марзалюк, І. А.* Гістарычная самаідэнтычнасць насельніцтва Беларусі ў XI–XVII стст. [Электронны рэсурс] / І. А. Марзалюк. – Рэжым доступу: http:// www. lingvo. minsk.by /mab/Glook/BVOKS/ Albaruthenica.htm. – Дата доступу: 02.02.2012.

12. Прядь об Эймунде Хрингссоне [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://norse.ulver.com/src/konung/eymund/ru2.html. – Дата доступа: 08.01.2015.
13. *Лященко, А. И.* «Eymundar saga» и русские летописи / А. И. Лященко // Изв. Акад. наук СССР. Сер. 6. – 1926. – Т. 20, № 12. – С. 1061–1068.
14. *Штыхов, Г. В.* Киев и города Полоцкой земли / Г. В. Штыхов // Киев и западные земли Руси в IX–XIII вв. – Минск, 1982. – С. 45–80.
15. *Сеньковский, О. И.* Скандинавские саги / О. И. Сеньковский // Библиотека для чтения, 1: III. – СПб., 1834. – С. 1–77.
16. Полное собрание русских летописей. – Л.: Изд-во Акад. наук СССР, 1926–1928. – Т. 1. – 379 с.
17. *Алексеев, Л. В.* Полоцкая земля (очерки истории Северной Белоруссии) в IX–XIII вв. / Л. В. Алексеев. – М.: Наука, 1966. – 296 с., ил.
18. *Семянчук, Г.* Усяслаў Брачыславіч, князь полацкі (штрыхі да гістарычнага партрэту) / Г. Семянчук // ARCHE. – 2004. – № 3. – С. 78–89 .

**(Дата подачи: 02.02.2015 г.)**

*А. А. Киселев*
Военная академия Республики Беларусь, Минск
*A. A. Kiselev*
Belarusian Military Academy, Minsk

**УДК 94(476):351.745 + 323.27 «1905/1907»**

## ИЗМЕНЕНИЯ В СТРУКТУРЕ ГОРОДСКОЙ ПОЛИЦИИ ГРОДНО И ПОЛИТИЧЕСКИЙ КРИЗИС 1905–1907 ГОДОВ

## CHANGES IN THE STRUCTURE OF GRODNO CITY POLICE AND THE POLITICAL CRISIS OF 1905–1907

*В статье анализируются изменения в структуре городской полиции Гродно в начале XX в. Штат полиции не соответствовал изменениям, которые произошли в городской жизни с 1863 г. Политический террор, массовые беспорядки и насилие во время политического кризиса 1905–1907 гг. не стали причиной кардинального увеличения полицейского штата. Проекты гродненских губернаторов по увеличению состава полиции не были одобрены Министерством внутренних дел и были заблокированы местным городским самоуправлением. История преобразования городской полиции косвенно показывает, что российское государство не являлось полицейским.*
*Ключевые слова: городская полиция; Министерство внутренних дел; белорусские губернии, штат; политический террор; плотность полиции.*

*Changes in the structure of Grodno city police in the early XX century are analyzed in the article. The police staff did not correspond with the changes which had taken place in urban life since 1863. Political terrorism, riots and violence during the political crisis of 1905-1907 did not lead to a significant increase in the police staff. Grodno governors' projects aimed to increase the police force had not been approved by the Ministry of Internal Affairs and were blocked by the local city government. The history of the transformation of the city police shows indirectly that the Russian state was not a police state.*
*Key words: city police; Ministry of Internal Affairs, Belarusian province, state; political terror; police density.*



В 1862 г. в результате общероссийской реорганизации местной полиции в губернских центрах и крупных уездных городах были созданы городские полицейские управления. Для белорусских губерний новая штатная структура городских полиций, в том числе и Гродненского ГПУ, была утверждена 17 февраля 1863 г. К этому времени численность городского населения Гродно оценивалась в 24 147 жителей. В структуре Гродненского ГПУ предусматривались должности полицеймейстера, 2 частных приставов, 6 помощников приставов, секретаря и 33 городовых. Плотность полиции составляла 1,8 человека на 1000 жителей. Польское восстание 1863–1864 гг. внесло свои коррективы: для увеличения жалования чиновникам была повышена разрядность управления, несколько лет существовала должность помощника полицеймейстера. За последующие 40 лет населенность города увеличилась в два раза, причем возросла не просто численность горожан, но существенно изменились социально-экономические, правовые и культурные условия их жизни. В течение этого периода некоторые преобразования затронули и организационную структуру Гродненского ГПУ: 14 декабря 1873 г. в штат ГПУ вместо двух должностей помощников приставов было введено 9 околоточных надзирателей, в 1896 г. полицейская команда увеличена с 33 до 60 чинов, а 1 февраля 1899 г. состав нижних чинов пополнился двумя городовыми фабричной полиции. Несмотря на эти изменения, в начале XX в. плотность городской полиции в Гродно составляла те же 1,8 человека на 1000 жителей. Однако этого количества полицейских в новой ситуации уже определенно не хватало, поскольку в силу процессов модернизации качественно менялась городская жизнь. Неспособность городской полиции эффективно справляться с новыми угрозами личной и общественной безопасности стала очевидной в условиях политического кризиса 1905–1907 гг.

Местные власти в лице губернатора, столкнувшись с массовым неповиновением, терактами против представителей власти и насилием, были вынуждены обратить свое внимание на состояние городской полиции. В частности, 16 марта 1905 г. гродненский губернатор М. М. Осоргин направил в адрес виленского генерал-губернатора А. А. Фрезе служебную записку, в которой излагал как общие соображения по реорганизации полиции в империи, так и конкретные предложения по улучшению службы Гродненского ГПУ. Так, губернатор докладывал о существовании в городе «тайной польской революционной организации», наличии агитации в учебных заведениях, ведении пропаганды «в рабочих кругах». При этом в Гродно «большая часть населения вооружена, без разрешения на это, огнестрельным оружием» [1, л. 116]. На случай беспорядков весь штат Гродненского ГПУ насчитывал вместе с полицеймейстером 16 чиновников и 60 нижних чинов «при населении города до 50 тысяч душ, массе специальных задач (охрана церквей, театров, разносная и конвойная служба и т. д.) и наличности 22 постов, разбросанных по всему городу» [1, л. 116]. В качестве неотложных мер